*Тарэса Адамовіч*

**«ВЯСКОВЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ» ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ *(дзейнасць фальклорнага гурта «Васілёчкі» па перайманні фальклору Панямоння)***

*Аўтар артыкула – педагог-лідар фальклорнага гурта – аналізуе дзейнасць сваіх выхаванцаў, дзіцячага ўзорнага ансамбля «Васілёчкі» Дзяржаўнай установы адукацыі «Гродзенскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі», па перайманні і захаванні рэгіянальнага фальклору Панямоння.*

*Taresa Adamovich*

**GRODNO REGION TRADITIONAL CULTURE «RURAL UNIVERSITIES» *(The activities of folk group «Vasiliochki» in the imitation of Paniamonnie folklore)***

*The author (the teacher-leader of the folk group) analyzes the performance of the pupils, the children's exemplary group «Vasiliochki» of The State educational institution «Grodno regional center of children and young people creativity» by imitation and the preservation of Paniamonnie regional folklore.*

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Эпіграфам да свайго артукула-эсэ, прысвечанага этнапедагогіцы, я хацела б зрабіць гэтае выказванне: «Усё пачынаецца з Любові: З Любові Сонца да зямлі – Жыццё. З Любові рук да працы – Хлеб. З Любові сэрцаў да зор – Песня». А з Любові чалавека да свайго краю, да тае мясціны, дзе ён нарадзіўся і вырас, вырастаюць, часам, суполкі аматараў і захавальнікаў традыцыйнай культуры і не толькі яны…

Я ніколі не была педагогам па адукацыі і наогул не ведаю, што такое быць педагогам з пункту гледжання афіцыйнай дыдактыкі, бо ў свой час вучылася ў Мінскім інстытуце культуры па спецыяльнасці «Арганізацыя і методыка клубнай работы», і ў 1983 годзе атрымала адпаведны дыплом аб вышэйшай адукацыі. Хочацца дадаць, што гады майго навучання ў гэтай установе былі вялікім святам у маім жыцці. Але я – Дзіця Вёскі, прытым – лясной, пушчанскай, Гарадзенскага краю і гэты край пасля заканчэння вучобы ў Мінску нібы магнітам пацягнуў да сябе. Верцялішкі, што ў Гродзенскім раёне, прынялі мяне цудоўна, там па тых часах быў рэнесанс народнай культуры і гэты рэнесанс на многія гады моцна схапіў мяне ў свае абдымкі.

З цягам часу мяне стала цікавіць пытанне, з якой культуры я выйшла. Адказ на яго прывёў спачатку ў беларускі фальклор, у суседнюю вёску Жытомля, а крыху пазней адчыніліся дзверы польскай культуры маёй роднай вёскі Танявічы, што ў Шчучынскім раёне. І я зноў пачала вучыцца, вучыцца ўсяму: мовам беларускай і польскай, песням, традыцыям, адкрывала для сябе народныя абрады і абрады рэлігійных канфесій, якія мелі месца быць сярод тых людзей, з якімі жыла. Я вучылася ў «вясковых універсітэтах», у якіх «выкладалі» цёткі і дзядзькі са шматлікіх вёсак Гродзенскага, Шчучынскага і Воранаўскага раёнаў Гродзенскай вобласці, якія ад усёй душы дзяліліся сваімі ведамі пра гісторыю і культуру нашай мясцовасці. Было неверагодна цікава. Людзі адкрываліся на шчырасць і добрае слова і аддавалі тое, што ведалі і чым калісьці жылі іх бацькі. Так з забыцця вярталася беларуская і польская культура майго народа і ствараліся адзін за другім тры мае аматарскія вясковыя калектывы.

1) У 1986 годзе – Народны тэатр народнай песні «Матуліна песня», вёска Жытомля, Гродзенскі раён (31 год існавання);

2) У 1991 годзе – польскамоўны фальклорны гурт «Matczyna Piesnia», вёска Танявічы, Шчучынскі раён як падарунак маім землякам (26 гадоў існавання);

3) У 2007 годзе-дзіцячы ўзорны фальклорны калектыў «Васілёчкі», вёска Жытомля, Гродзенскі раён (10 гадоў існавання).




Малюнак 1 – «Васілёчкі» на Вялікдзень «валокаюць», в. Азярцо, БДМНАіП, 2016



Research conferences

Вера Стоянова

Выступает ансамбль «Сладчына». Рук. Тереса Голович

ми народными музыкальными инструментами познакомил слушателей руководитель ансамбля «Айнаколь», прекрасный исполнитель на думбыре и дутаре, Руслан Кайшыбаев («Фольклор Северного Казахстана»).

Дальнейшая работа конференции проходила по ставшим традиционными секциям: «Нематериальное культурное наследие и его охрана», «Трансформации видов и жанров аутентичного фольклора», «Семантика и мифопоэтика традиционной обрядовости», «Традиционная культура в книге, образовательном пространстве и арттерапии», «Экология традиционной художественной культуры», «Проблемы органологии и морфологии музыкальных инструментов», «Вклад рода Шемякиных в изучение и популяризацию фольклора (к 95-летию со дня рождения Ивана Шемякина)», «Проблемы певческой этнофонии». Всего состоялось 106 докладов в восьми секциях.

Тематика конференции затрагивала самые широкие аспекты изучения народной культуры. Обозначим лишь некоторые: забота о культурном наследии в разных странах (Энгельс Дорошевич, Ирина Петрова, Зоя Босых, Наталья Шелупенко, Сяо Жань), обрядовая культура регионов (Эвелина Щадрина, Чжу Гэлимэн, Ирина Глушец, Лариса Романова, Катерина Осадчая), взаимосвязи традиционной и современной культуры (Алексей Бураякин, Екатерина Гайдукевич, Чжао Аиань, Надежда Коршунова), проблемы популяризации фольклора (Константин Трамбицкий, Любовь Новик, Дарья Веремейчук, Анна Бобченок, Тадеуш Стружецкий).

Заслуживают внимания доклады, посвященные этнопедагогике (Николай Иваненко, Юрий Бундин) и различным видам искусства: танцевальному (Ольга Беляева, Наталья Карчевская, Светлана Гродникова, Павел Стрельченко, Ирина Ковальчик), декоративно-прикладному (Марина Машедо, Наталья Наркевич, Виола Казанина), театральному (Инна Алексина, Дарья Мардань, Алексей Рагуля) и киноискусству (Алена Мощенок, Чжао Дундун).

Ряд сообщений познакомил участников конференции со сборниками по молдавскому фольклору (Вера Стоянова), претворением некоторых элементов фольклора в композиторской практике (Чжан Синьлян, Янис Пурвиньш), а также — с традиционными песенными жанрами Беларуси: свадебными (Юлия Стрижиченко) и календарно-обрядовыми (Римантас Слюжинскас, Галина Таэлай, Галина Кутырева-Чубаля).

Интерес аудитории вызвали сообщения по истории собирания и изучения народных музыкальных инструментов (Ирина Попова, Татьяна Бабич), их хранении и реконструкции (Татьяна Волчок), применении в современной исполнительской практике (Игорь Мангушев, Йозеф Ратайчак, Дариуш Адам Ледзион).

Подробнее с докладами можно ознакомиться в сборнике материалов конференции, выпущенного к началу работы форума[1].

Первый день конференции завершился показом этнографического фильма и концертом «Фольклор белорусской глубинки». В концерте, который блестяще провела преподаватель кафедры этнологии и фольклора БГУКИ Татьяна Пладунова, приняли участие коллективы «Васілёчкі», «Сладчына», «Матырына» и «Павалякі». Фольклорные группы представили традиционную певческую культуру, характерную для историко-этнографических регионов Понеманья, Подвинья и Центральной Беларуси. Фильм «Чырачка»[2] Регины Гамзович продемонстрировал воссозданный древний белорусский обряд встречи весны из деревни Тонеж Лельчиц-

[1] Аутэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29 красавіка — 1 мая 2016 г.) / БДУКіМ; рэдкал.: Якжэвіч В. Р. (адк.рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУКіМ, 2016.

[2] Чырачка (по белорусски, «подплавающая утка») — особое праздничное печенье в форме птиц, выпекаемое для встречи весны в конце масленичной недели.

38 MUSICUS • №2 • апрель • май • июнь • 2016

Малюнак 2 – Старонка журнала «Musicus» (СПб., Расія) з выявай гурта, 2016

10 гадоў існавання дзіцячага ўзорнага фальклорнага гурта «Васілёчкі» на фоне 30-гадовай дзейнасці дарослага фальклорнага калектыву «Матуліна песня», у склад якога першыя 20 гадоў уваходзіла каля 40 чалавек, лічба сімвалічная, карацей кажучы, афіцыйная, таму што дзеці пры «Матулінай песні» былі заўсёды, з самых першых дзён заснавання калектыву. Яны глядзелі на бацькоў, бабуль, дзядоў, цётак, суседзяў і беглі за імі на рэпетыцыі ручаём (па 20-25 чалавек).

Трэба адзначыць, што «Матуліна песня» ў Жытомлі першыя дзесяцігоддзі сваёй дзейнасці была фантастычна папулярнай у сваёй вёсцы, зала сельскага дома культуры падчас выступленняў была заўсёды перапоўнена. З тых першых дзён і да сённяшняга, напрыклад, з жытамлянскай сям'і Шкрэдавых спявалі народныя песні і ўдзельнічалі ў шматлікіх абрадавых дзеяннях на аматарскай сцэне 4 пакаленні (ад прабабулі да праўнучкі), у «Васілёчках» зараз паспяхова выступае праўнучка Ангеліна, якая яшчэ не ўмее чытаць, а з сям'і Казлоўскіх, у якой многія гады артыстамі-аматарамі былі ўсе, сын Арцём зараз з'яўляецца студэнтам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,. Прыкладаў можа быць многа.

Асабіста для сябе я б вызначыла 4 групы жытамлянскіх дзяцей, якія былі зацікаўлены народнымі традыцыямі: 2 групы да 2007 года і 2 групы пасля. Чаму 2007 год? Бо ў 2007 годзе дзіцячы фальклорны гурт з Жытомлі ўзяла пад сваё крыло ДУА «Гродзенскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі». Адгэтуль паходзіць афіцыйны статус калектыву. Гледзячы неяк на каласістыя палеткі з васількамі, я вырашыла, што так і мусіць называцца дзіцячы гурт –«Васілёчкі». У 2016 годзе «Васілёчкі» атрымалі званне «ўзорны».

Чым займаліся дзеці ў калектыве? Каляды і Вялікдзень (мал. 1) з намі былі заўсёды. Мы з году ў год хадзілі калядаваць і валокаць па сваёй вёсцы, ладзілі «Шчодрык» (для дарослых) і «Шчадрэц» з засяваннем (для дзяцей) на сцэне, пераймалі народныя звычаі, абрады, народныя песні і побытавыя танцы ў старэйшых жытамлянскіх бабуль, здымаліся ў тэлевізійных перадачах «Запрашаем на вячоркі», «Спявай, душа» і іншых. Ставілі на сцэне абрад «Зажынкі» са снапом Спарышом, знаёміліся з купальскай тэматыкай, больш 10 гадоў ездзілі на велікодны фестываль «Канапелька» ў Кнышын (Польшча), дзе збіраюцца валачобнікі з Падляшша, Сувалак, Літвы, польскія навукоўцы, журналісты з тэлебачання і радыё, беластоцкая культурная і кіруючая эліта.

Дзеці не проста ездзілі разам з дарослымі, але яшчэ і вельмі годна сваім мастацтвам прадстаўлялі Беларусь за мяжой. Інфармацыя пра калектыў трапіла нават у акадэмічныя музыказнаўчыя выданні (мал. 2). А яшчэ не так даўно старшая група «Васілёчкаў» разам з «Матулінай песняй» удзельнічала ў двух прадстаўленнях: «Выправы да войска» і «Прыезд маладой да маладога», якія зноў, як калісьці, сабралі на прагляд усю вёску.

А цяпер аб тым, чым займаюцца дзеці ў калектыве. Дзякуючы афіцыйнаму статусу калектыва з'явіліся новыя магчымасці. Так, мы з году ў год выязджаем у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» на Рэспубліканскі конкурс «Юныя таленты Беларусі» з фальклорнымі абрадамі «Вялікдзень» і «Гуканне вясны» і, дзякуючы кампетэнтнаму журы з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Вячаслаў Калацэй, Уладзімір Зяневіч, Энгельс Дарашэвіч), прывозім адтуль вельмі высокія вынікі (мал. 3), з якімі прыходзіцца лічыцца ўсім на месцы. Але ў першую чаргу гэтыя вынікі прыносяць вялікую сатысфакцыю дзецям, іх бацькам і ўсёй вёсцы.


МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ДИПЛОМ

II СТЕПЕНИ

НАГРАЖДАЕТСЯ

образцовый фольклорный коллектив «ВАСІЛЁЧКІ» (ГУО «Гродненский районный центр творчества детей и молодежи», руководитель Адамович Тереса Антоновна) за победу в республиканском конкурсе фольклорных коллективов в рамках республиканского конкурса «Юные таланты Беларуси»

Заместитель Министра Р.С. Сидоренко

Малюнак 3 – Дыплом лаўрэата Рэспубліканскага конкурса, 2017




Малюнак 4 – Расповед пра традыцыі Панямоння на міжнароднай навуковай імпрэзе, 2016

У 2016 годзе старшая група «Васілёчкаў» выступала на юбілейнай X Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор» [1] з велікодным абрадам «Хаджэнне ў валакайнікі» і вярнулася з Мінска з вялікім уражаннем аб тым, што пабачыла і пачула. Прыемна ўразіла, што апісанне і фота калектыва (мал. 2) трапіла ў спецыяльнае музыкалагічнае выданне Санкт-Пецярбурскай кансерваторыі [2], а сусветнавядомыя даследчыкі з Беларусі, Польшчы, Расіі, Літвы, Малдовы і Казахстана з цікавасцю слухалі не толькі спевы, але і нашыя думкі пра фальклорную спадчыну (мал. 4).

У 2017 годзе ў «Васілёчках» зноў змена артыстаў, прыйшлі маленькія – 13 чалавек, якія месяц таму прывезлі з летніка «Зубраня», з Рэспубліканскага конкурса «Юныя таленты Беларусі» 2-е месца лаўрэата ў спаборніцтве па фальклорных абрадах. Усё паўтараецца, калі любіш тое, што робіш.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**Спіс літаратуры:**

1. Аўтэнтычны фальклор : X Міжнародная навуковая канферэнцыя // БДУКМ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.buk.by/news_detail.php?ID=3244. – Дата доступу: 12.02.2017.
2. Стоянова, В. Международная научная конференція в Минске / В. Стоянова // Musicus. – СПб. : СПбГК, 2016. – № 2 (46). – С. 37–39.



***Алёна Мощёнок***


## ЭВОЛЮЦИЯ ТРАДИЦИОННОГО АМПЛУА АВГУСТА В ЦИРКОВОМ ИСКУССТВЕ XX ВЕКА


***Alyona Moshchyonok***


## THE EVOLUTION OF THE TRADITIONAL ROLE OF AUGUST IN THE CIRCUS ART OF THE 20th CENTUTY


*В статье исследуются особенности становления и развития в значительной степени традиционного по этиологии исполнительского амплуа Августа (глупого, смешного и нелепого персонажа, Рыжего клоуна) в цирковом искусстве XX века.*

*In the article the features of the formation and development of the largely traditional etiology of August's performance (a stupid, funny and ridiculous character, the Red Clown) in the circus art of the 20th century are analyzed.*


В фольклорных действах многих народов, карнавальных шествиях ряженых, календарных празднествах и культовых играх фигурирует гротескно-комичный персонаж, которого обобщённо называют «шутом», «дурнем». Именно этого постоянного участника увеселений считают предтечей цирковых клоунов [3, с. 29]. С течением времени данный персонаж трансформируется и появляется на цирковом манеже.

Во второй половине XIX века понятие «клоун» трактуют как «артист цирка, исполняющий комичные, сатиричные номера, построенные на приёмах буффонады, эксцентрики, гротеска и пародии» [1, с. 193]. Несколько позже клоуна начинают именовать представителем «жанра, типа, амплуа» [4, с. 6]. Так, в конце XIX в. происходит оформление клоунады как циркового жанра, чему способствует появление на манеже амплуа Августа.

Традиционное амплуа Августа в западноевропейском цирке утверждают в 1870-е – 1880-е годы Том Беллинг, Чедвик и Джемс Гюйон. Созданное амплуа Августа представляет собой образ-маску глупого, смешного и нелепого персонажа. Законченность образу Августа придаёт традиционный наряд комического персонажа – окарикатуренная униформа служителя манежа: сшитый не по размеру мешковатый балахон, клетчатые штаны и огромные башмаки, грим. Изначально Августы не имеют определённого репертуара и появляются на манеже эпизодически, заполняя паузы между номерами основного циркового действия.

Эволюция традиционного амплуа Августа прослеживается в творческой деятельности клоуна Шоколада. Ориентируясь на традиционное амплуа Августа, Шоколад утверждает клоунский образ Августа-слуги, характерными чертами которого становятся глупость, неуклюжесть и непрекословное подчинение своему партнёру – клоуну. Также цирковой комик вносит изменения в традиционное одеяние Августа – он предстаёт на арене в элегантном костюме светского человека. Созданное амплуа Августа-слуги находит воплощение в клоунских образах Августов Антонио и Бэби.

Существенное влияние на эволюцию амплуа Августа оказывает артист цирка Маленький Уолтер, который создаёт новое клоунское амплуа – гордого и дерзкого Августа. Утверждённую цирковой традицией, характерную черту Августа – глупость, Маленький Уолтер скрывает за утрированной самоуверенностью и серьёзностью. При формировании образа Августа значительное внимание Маленький Уолтер придаёт внешнему облику своего персонажа. На смену элегантному вечернему наряду Августа, представленному Шоколадом, приходит аккуратный костюм горожанина. Амплуа гордого Августа лежит в основе клоунских образов Августов Алекса и Поля Фрателлини.

Следующий этап эволюции амплуа Августа связан с возникновением образа Августа-бродяги. Амплуа Августа-бродяги утверждает Эмиль Луайяль, который воплощает на цирковом манеже образ доброго, весёлого, смешного и всегда довольного собой бедняка. Законченность образу бродяги придаёт соответственно подобранный костюм Августа, состоящий из широкой сорочки, пиджака, узких брюк, потрёпанных башмаков и цилиндра. Также амплуа Августа-бродяги соответствует клоунский образ Альбера Фрателлини, который предстаёт на цирковом манеже в роли молчаливого, неуклюжего и доброго бродяги.

Дальнейшее развитие традиционного амплуа Августа отражено в образе Августа-пьянчужки, созданном клоуном Барио. Характерные черты Августа-пьянчужки заключены в глупости, легкомысленности, нерасторопности и жизнерадостности человека, который получает удовольствие от естественных проявлений жизни. Позже черты Августа-пьянчужки характеризуют образ циркового артиста Карлетто, выступающего на манеже в роли бродячего музыканта-алкоголика.

Необходимо отметить, что амплуа Августов Шоколада, Антонио, Бэби, Маленького Уолтера, Поля Фрателлини, Эмиля Луайяля, Барио, Карлетто и других Августов, выступавших на манеже западноевропейского цирка в XX века, формируются во время сотрудничества с клоунами, т.е. в клоунских дуэтах, трио или квартетах. Взаимодействуя с клоунами, Августы уже не заполняют паузы во время основного действия, а являются полноправными участниками цирковой программы. Цирковые комики выходят на манеж в клоунском антре, с репризами и небольшими интермедиями.

В клоунских образах, созданных Августами Маленьким Уолтером, Эмилем Луайялем и Барио прослеживаются предпосылки формирования Августа-эксцентрика. Теоретики цирка трактуют понятие «эксцентрик» как клоуна, который строит свои выступления не на словесном комизме, а на трюковом действии [2, с. 294]. В отличие от традиционного амплуа Августа, особенностью циркового эксцентрика является тот факт, что эксцентрик не содержит в своём характере черты, свойственные глупому персонажу. Эксцентрик умён, остроумен и самодостаточен. На цирковой арене эксцентрики, в большинстве случаев, выступают сольно – комики не нуждаются в партнёре, а для создания комичных ситуаций используют различные аксессуары.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ